Падтрымай "Вясну" на PATREON

Два гады "хатняй хіміі" за "счэпку". Гродзенцаў працягваюць судзіць за ўдзел у леташнім "Маршы адзінства"

19.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, свабода мірных сходаў

Гэтым разам суд Кастрычніцкага раёна Гродна разгледзеў крымінальную справу 28-гадовай бухгалтаркі Дар'і Давідовіч. Дзяўчыну прызналі вінаватай ва ўдзеле ў "Маршы адзінства" 6 верасня мінулага года паводле ч. 1 арт. 342 КК — "Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх".

Суды над гродзенцамі за ўдзел у леташнім "Маршы адзінства" працягваюцца. Большасць гэтых працэсаў падобныя: прыкладна адны і тыя ж абвінавачванні зачытвае пракурор, прыкладна адны і тыя ж пытанні задаюць абвінавачаным, прыкладна адны і тыя ж прысуды ім выносяць. Змяняюцца толькі прозвішчы, дэталі справы і лёсы падсудных. Амаль кожнага з іх прысуджаюць да некалькіх гадоў "хатняй хіміі". Так было і гэтым разам.

Цалкам прызнала сваю віну

На лаве падсудных была 28-гадовая бухгалтарка з Гродна **Дар'я Давідовіч**. Для разгляду ейнай справы суду спатрэбілася шэсць пасяджэнняў. Працэс вёў суддзя **Віталь Лабоцкі**, бок абвінавачвання падтрымліваў пракурор **Станіслаў Пранько**.

Паводле версіі абвінавачвання, 6 верасня мінулага года Дар'я Давідовіч *"узяла актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, што груба парушаюць грамадскі парадак"*.

Таксама абвінавачванне сцвярджае, што ўдзел у "Маршы адзінства" Дар'я Давідовіч узяла наўмысна, разумеючы, што парушае Закон "Аб масавых мерапрыемствах". Больш за тое, са слоў пракурора, падсудная аказала непадпарадкаванне законным патрабаванням прадстаўнікоў улады, *"натхняючы сваімі паводзінамі навакольных удзельнічаць у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве, парушыўшы ўмовы адпачынку і побыту грамадзян і замахнуўшыся на парушэнне грамадскага спакою"*.

Пракурор настаяў, што падчас мітынгу дзяўчына ўзялася ў "счэпку" з іншымі ўдзельнікамі маршу, і праз гэта рух грамадскага транспарту аказаўся заблакаваным. Абвінавачванне абвясціла і шкоду, якую сваімі дзеяннямі Дар'я нібыта нанесла мясцоваму аўтобуснаму парку і тралейбуснаму ўпраўленню — 20 рублёў 10 капеек і 51 рубель 59 адпаведна. Усяго — **71 рубель 69 капеек**.

"Сваімі наўмыснымі дзеяннямі Давідовіч здзейсніла злачынства, прадугледжанае ч. 1 арт. 342 КК РБ — "Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх", — настаяў пракурор.

Калі слова далі падсуднай, тая **цалкам прызнала сваю віну**. Таксама стала вядома, што 7 верасня яе ўжо затрымлівалі па падазрэнні ў крымінальным злачынстве. І тады дзяўчына правяла пад вартай 9 сутак.

Пракурор задаваў шмат пытанняў пра падпіску падсуднай на тэлеграм-каналы, выкарыстанне месэнджараў і высвятляў акалічнасці, пры якіх 6 верасня мінулага года дзяўчына апынулася на "Маршы адзінства".

Дар'я растлумачыла, што ў той дзень яна была выхадная і вырашыла выйсці прагуляцца ў цэнтр горада. А калі прыйшла, пабачыла там шмат людзей. Некаторыя, як кажа дзяўчына, былі з плакатамі.

> *"Калі я падышла, супрацоўнікі міліцыі, АМАП пачалі затрымліваць грамадзян",* — сказала дзяўчына. Таксама падабаронная пацвердзіла, што падчас затрымання людзей яна знаходзілася ў натоўпе, але потым выйшла з яго і пайшла ў бок вул. Савецкай.
>
> *"Навошта вы выходзілі на праезную частку?"* — задаў пытанне пракурор.
>
> *"Не ведаю, цікава было",* — адказала абвінавачваная.
>
> *"Што яшчэ?! Вам колькі гадоў?!"* — перайшоў на эмоцыі прадстаўнік абвінавачвання.
>
> *"Выйшлі людзі, я выйшла",* — сказала Дар'я.
>
> *"Людзі з моста скокнуць — я скокну?"* — працягнуў пракурор.
>
> *"Былі эмоцыі",* — адказала падсудная.



Гродзенцаў працягваюць судзіць за ўдзел у "Маршы адзінства", які адбыўся летась у верасні. Фота: grodnonew.com

Хацела выказаць пратэст супраць гвалту

Пытанні задаваў і суддзя:

> *"Дар'я Васільеўна, вы абвінавачванне чулі? Вы паказалі, што віну прызнаяце. Зыходзячы з вашых тлумачэнняў... Я не тое што вас папракаю... Калі вы віну прызнаяце, то ў чым?"*

Дар'я адказала, што прызнае актыўны ўдзел у мітынгу і растлумачыла, што гэта азначае тое, што *"не прыняла для сябе рашэнне сысці, калі апынулася ў натоўпе людзей, і працягвала ўдзельнічаць у мітынгу. Ішла па дарозе"*. Таксама дзяўчына патлумачыла, што ў "счэпцы" з астатнімі людзьмі яна апынулася, калі побач з прыпынкам "Савецкая" пачаліся затрыманні, і што заклікаў разыйсціся з боку міліцыі яна не чула, бо было шумна і людзі крычалі лозунгі.

> *"Ці разумелі, з якой мэтай яны крычалі?"* — запытаў пракурор.
>
> *"Так, мітынг супраць гвалту"*, — адказала Дар'я.
>
> *"Гвалту якога?"* — удакладніла абвінавачванне.
>
> *"Гвалт быў раней"*, — працягвала трымаць адказ Дар'я.
>
> *"Хто ўжыў гвалт?"* — працягнуў задаваць пытанне пракурор.
>
> *"Падзеі 9 жніўня",* — сказала дзяўчына.
>
> *"А што было?"* — спытаў абвінаваўца.
>
> *"Падзеі, калі супрацоўнікі перавышалі свае паўнамоцтвы",* — адказала Дар'я Давідовіч.
>
> *"А вы адкуль ведаеце?"* — задаў чарговае пытанне пракурор.
>
> *"У інтэрнэце пабачыла",* — трымала адказ падсудная.

Далей пракурор доўга і ўедліва ўдакладняў, ці бачыла дзяўчына заклікі ў інтэрнэце прыйсці на гэты марш, ці былі яны ў тых СМІ, на якія яна падпісаная ў месэнджарах, ці дзейнічала яна з кімсьці паводле папярэдняй змовы. На апошняе пытанне дзяўчына адказала адмоўна.

> *"З вашых слоў вы прызнаяце, што ўдзельнічалі ў групавых дзеяннях, так? Тым самым груба парушаючы грамадскі парадак, што пацягнула парушэнне працы транспарту, звязанае з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады",* — спытаў ужо суддзя.
>
> *"Так",* — адказала дзяўчына.

Пасля яшчэ некалькіх пытанняў пракурора суддзя зноў звярнуўся да падсуднай:

> *"Мэта вашых дзеянняў — выказаць пратэст супраць гвалту, які ўжывалі супрацоўнікі міліцыі, як вам стала вядома з навінавых каналаў?"*
>
> *"Так",* — сказала Дар'я.

Суддзя паставіў на дазвол пытанне аб магчымасці далейшага працягу судовага следства ў адсутнасць сведак, якія не з'явіліся. Адвакат не настойвала на выкліку сведак, аднак дзяржабвінаваўца заявіў, што настойвае.

На наступных судовых пасяджэннях па справе Дар'і Давідовіч, якія адбыліся 17 і 18 лістапада, былі выслуханыя і зачытаныя паказанні сведак і вывучаныя пісьмовыя матэрыялы справы. Сведак, якія з'явіліся на судовыя пасяджэнні, апытвалі за шырмай *"у мэтах забеспячэння асабістай бяспекі"*. Гэта былі супрацоўнікі міліцыі.

19 лістапада 2021 суд вынес свой вердыкт. **Дар'ю Давідовіч прызналі вінаватай** у здзяйсненні крымінальнага злачынства паводле ч. 1 арт. 342 КК — "Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх" **і асудзілі да двух гадоў "хатняй хіміі".**

Твитнуть





Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"




#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля райда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023


ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY